арганізацыі. Узмацненне залежнасці ад палітыкі царскага ўрада, яе ідэалагічны напрамак патрабавалі ад святароў пільнага нагляду за маральным і рэлігійным жыццём насельніцтва, што нярэдка супярэчыла прынцыпам духавенства. Але праваслаўнае духавенства выконвала свой грамадзянскі абавязак, прымаючы актыўны ўдзел у вырашэнні сацыяльных праблем грамадства.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Всеподданнейший отчет обер-прокурора Святейшего Синода К. Победоносцева по ведомству православного исповедания за 1900 год. — СПб.: синодальная типография, 1903. — 488 с.
2. Всеподданнейший отчет обер-прокурора Святейшего Синода по ведомству православного исповедания за 1914 год. — Пг.: Синод. тип., 1916. — С. 68—71.
3. Яноўская, В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі 1863—1914 гг. / В.В. Яноўская. — Мінск: БДУ, 2002. — 199 с.: іл.



**Каханоўскі Аляксандр Генадзьевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*


# БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСТВА НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

У айчыннай гістарыяграфіі разгляд пытанняў развіцця беларускага грамадства ў пачатку XX ст. носіць дастаткова традыцыйны характар, нягледзячы на пашырэнне тэматыкі, выкарыстанне на сучасным этапе новых даследчыцкіх прыёмаў, дадатковых дакументальных крыніц. Для яе характэрна ў значнай ступені апісальнасць у аналізе сацыяльных працэсаў на тэрыторыі Беларусі. Стан сённяшняга вывучэння дазваляе акрэсліць іх агульныя абрысы, вызначыць напрамак уплыву сацыяльна-эканамічных фактараў. Нярэдка сустракаюцца супярэчлівыя ацэнкі стану развіцця Беларусі напярэдані Першай сусветнай вайны.

Паводле звестак на 1 студзеня 1914 г., насельніцтва беларускіх губерняў налічвала 11 569,6 тыс. чалавек, у тым ліку ў 35 беларускіх паветах — 8952,8 тыс. чалавек [15, с. 33—36, 39, 47]. Калі ўлічыць насельніцтва Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні (242,3 тыс. чалавек), значная частка якога ўваходзіць у межы сучаснай беларускай дзяржавы, то насельніцтва Беларусі ў межах, блізкіх да сучасных дзяржаўных, склала каля 9100,0—9150,0 тыс. чалавек. У 1914 г. удзельная вага гарадскога

насельніцтва ў беларускіх губернях склала 13,4 %, у межах 35 паветаў — 10,9 %. Гэты паказчык ужо быў некалькі ніжэй за сярэдні па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі — 14,4 %. Больш высокая ўдзельная вага гарадскога насельніцтва была характэрнай для Гродзенскай (18,1 %) і Віцебскай (16,7 %) губерняў. Найменшая ступень урбанізаванасці назіралася ў Мінскай губерні (9,8 %) [15, с. 33—36, 39, 47].

У канцы XIX ст. вызначылася заўважная тэндэнцыя ўніфікацыі працэнтных суадносін саслоўных груп у складзе насельніцтва беларускіх губерняў і сярэдніх паказчыкаў па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі, аднак першыя па-ранейшаму вылучаліся больш высокай удзельнай вагой дваранства і мяшчанства. Напярэдадні Першай сусветнай вайны звяртае на сябе ўвагу зніжэнне ўдзельнай вагі сялянства ва ўсіх губернях у параўнанні з 1897 г.: у Віленскай — з 75,3 да 69,8 %, Віцебскай — з 78,19 да 72,8 %, Гродзенскай — з 72,5 да 68,4 %, Магілёўскай — з 80,1 да 71,7 %. Знізілася таксама ўдзельная вага спадчыннага дваранства. У пачатку XX ст. гэта была агульная тэндэнцыя па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі, дзе ўдзельная вага спадчыннага дваранства ў сярэднім зменшылася на 1/3 — з 1 да 0,7 % [6, с. 222]. У Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губернях за абазначаны час вырасла працэнтная доля мяшчан. Яна па-ранейшаму ў 1,5—2 разы перавышала сярэдні паказчык для губерняў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі (12,1 %) [6, с. 222]. На змены саслоўнага складу насельніцтва ўплывалі, перш за ўсё, працэсы міжсаслоўнай і тэрытарыяльнай мабільнасці, якія ахоплівалі ў пачатку XX ст. колькасна значныя групы людзей, а таксама ўрадавая палітыка. Да канца XIX ст. адчувальнай стала тэндэнцыя пераўтварэння асобных саслоўяў у ганаровыя званні, але для Беларусі яна стрымлівалася абмежавальнымі мерапрыемствамі ў дачыненні да католікаў і яўрэяў.

У пачатку XX ст. ва ўрадавай палітыцы акрэслілася новая тэндэнцыя надання сялянству палітычных і грамадзянскіх праў. На тэрыторыі беларускіх губерняў дадзены працэс набыў спецыфічную афарбоўку ў адпаведнасці з мясцовай этнаканфесійнай сітуацыяй і неабходнасцю ўлічваць традыцыйныя ўстоі беларускага сялянства. Сялянства захоўвала свае адметныя саслоўныя рысы, нягледзячы на ніверліроўку ў заканадаўстве ўнутры- і міжсаслоўных меж. Больш таго, у паслярэформенныя дзесяцігоддзі адбылася кансалідацыя розных груп сялянства ў межах аднаго саслоўя. З другога боку, паглыбленне ў канцы XIX — пачатку XX ст. сацыяльна-маёмаснага размежавання сялянства Беларусі, пашырэнне яго міграцыйнай і сацыяльнай актыўнасці аб’ектыўна садзейнічалі разлажэнню яго як саслоўя і пераўтварэнню ў сацыяльна-

прафесійную групу, звязаную з сельскагаспадарчай вытворчасцю, выхадцы з якой папаўнялі шэрагі класаў буржуазнага грамадства.

Беларусь у пачатку XX ст. вызначалі больш высокія тэмпы прамысловага развіцця, чым у сярэднім па Расійскай імперыі. Першыя гады XX ст. вызначыліся прамысловым крызісам. У Беларусі крызіс праявіў сябе перш за ўсё ў фінансава-крэдытнай сферы. Прамысловасць ён закрануў пазней [17, с. 24—25]. Пасля прамысловага крызісу пачатку XX ст. выразна прасочваецца тэндэнцыя пашырэння перапрацоўкі сыравіны, якая раней пастаўлялася на продаж у неапрацаваным выглядзе, актывізавалася развіццё дрэваапрацоўкі [1, с. 36]. З 1910 г. пачаўся інтэнсіўны пад'ём прамысловай вытворчасці Беларусі, калі прырост аб'ёму вырабляемай прадукцыі быў у 1,9 раза вышэй, чым за папярэдні васьмігадовы перыяд [17, с. 36]. Нягледзячы на імклівы эканамічны рост, удзельная вага прамысловай вытворчасці беларускіх і літоўскіх губерняў у агульнай суме прамысловай вытворчасці Расійскай імперыі за 1908—1912 гг. зменшылася з 1,9 да 1,7 % [2, с. 85].

Найбольш выразна адрознівала Расійскую імперыю ў пачатку XX ст. ад індустрыяльных краін тагачаснага свету неадпаведнасць паміж сукупным аб'ёмам прамысловай вытворчасці і адносна нізкім узроўнем вытворчасці ў пераліку на душу насельніцтва. У 1913 г. вытворчасць на душу насельніцтва ў Расійскай імперыі складала 40 % ад адпаведнага паказчыка Францыі і Германіі, толькі каля 20 % Англіі і 16 % ЗША [3, с. 20]. Аб'ём прамысловай вытворчасці у пераліку на кожнага жыхара Расійскай імперыі склаў у 1908 г. у сярэднім каля 30 руб. Беларускія губерні па гэтым паказчыку адставалі ад агульнарасійскага ўзроўню, нягледзячы на імклівую дынаміку ў пачатку XX ст. У 1897 г. сума прамысловай вытворчасці ў пераліку на кожнага жыхара ў Віленскай губерні склала 6,7 руб., а ў 1908 г. — 10 руб.; у Віцебскай губерні — адпаведна 2,7 і 6 руб., у Гродзенскай — 10,7 і 12 руб., у Мінскай — 4,1 і 6 руб., у Магілёўскай — 5,3 і 6 руб. [5, с. 182].

Фабрыкі і фабрычная сістэма паступова разбуралі даіндустрыяльныя формы вытворчасці. Асяродак рабочых быў заснаваны на асаблівым жыццёвым вопыце, вызначаўся ўласнай нормай паводзін і больш высокім у параўнанні з сельскімі жыхарамі ўзроўнем пісьменнасці. Аднак рабочы клас у значнай ступені складаўся з учарашніх сялян, якія захоўвалі заўважную сувязь з сельскагаспадарчай вытворчасцю. Фарміраванне рабочага класа ў Беларусі стрымлівалася канфесійнымі, нацыянальнымі і саслоўнымі, а адпаведна і прававымі адрозненнямі паміж рознымі яго групамі, а таксама раз'яднанасцю па невялікіх прадпрыемствах. Рабочыя складалі ў 1913 г. каля 5,6 % насельніцтва

Беларусі, па Расійскай імперыі — 8,8 %. Удзельная вага наёмных работнікаў Беларусі ў складзе расійскага пралетарыяту была дастаткова невысокай — 2,7 % [17, с. 374]. Нават сельскагаспадарчы пралетарыят Беларусі меў невысокі паказчык удзельнай вагі сярод аналагічнай групы расійскіх рабочых — 3,2 %. Структура рабочага класа Беларусі мела заўважныя адрозненні ад яго структуры па Расійскай імперыі, перш за ўсё вызначалася меншай удзельнай вагой фабрычна-заводскіх рабочых сярод наёмных работнікаў і ў агульнай масе насельніцтва. Апошні колькасны паказчык па Беларусі складаў каля 0,6 %, па Расійскай імперыі — 2,0 %.

На мяжы XIX—XX стст. заўважна больш інтэнсіўнымі становяцца гандлёва-эканамічныя сувязі беларускіх губерняў з суседнімі рэгіёнамі Расійскай імперыі і замежнымі краінамі, уплыў на фінансава-гаспадарчую дзейнасць міжнародных палітычных працэсаў. Напрыклад, ускладненне палітычнай сітуацыі на Балканах у 1912 г. адразу ж адмоўна паўплывала на гандлёвыя аперацыі на расійскіх біржах, прывяло да стрыманай крэдытнай палітыкі банкаў, што, у сваю чаргу, негатыўна адбілася на мясцовай гандлёва-прамысловай дзейнасці [4, л. 60—61].

Значны ўплыў на эканамічную, палітычную, этнакультурную сферы развіцця беларускага грамадства аказалі працэсы пашырэння тэрытарыяльнай мабільнасці насельніцтва, аптымізацыі размяшчэння вытворчых сіл. На мяжы XIX—XX стст. кірунак і памеры міграцыйных рухаў змяняюцца. Гэта было абумоўлена структурнымі зменамі ў эканоміцы Расійскай імперыі і ў падыходах да вызначэння прыярытэтаў па міграцыйным пытанні ва ўрадавай палітыцы. Невысокі попыт беларускай прамысловасці на працоўную сілу, абвастрэнне аграрнай перанаселенасці, паварот ва ўрадавай палітыцы да заахвочвання сялянскіх перасяленняў на ўсход краіны, скарачэнне міграцый вясковых жыхароў з прамысловых расійскіх цэнтраў і суседніх з імі рэгіёнаў вывелі Магілёўскую і Віцебскую губерні на першыя пазіцыі ў краіне па колькасці перасяленцаў у Сібір.

На мяжы XIX—XX стст. у міграцыйныя працэсы было ўключана 1455,4 тыс. жыхароў і ўраджэнцаў беларускіх губерняў (каля 17,0 % іх насельніцтва). Тут не ўлічаны тыя, хто накіроўваўся на сезонныя адыходныя промыслы і перасяляўся ў межах аднаго павета [10, с. 22—27; 11, с. 25—31; 12, с. 49—55; 13, с. 45—49; 14, с. 45—49]. У пачатку XX ст. адыходнымі промысламі было занята 6,5 % сельскага насельніцтва Беларусі, а з улікам толькі працаздольнай яго часткі — каля 13 % [9, с. 72]. На мяжы XIX—XX стст. расійскі ўрад сутыкнуўся з неабходнасцю рэгулявання масавай эміграцыі насельніцтва за мяжу, асабліва

ў заходніх рэгіёнах дзяржавы. Губернатары на пачатковым этапе сваімі цыркулярамі падначаленым імкнуліся спыніць тайную сялянскую эміграцыю ў краіны Еўропы і Амерыкі. Адносіны і аргументацыя былі амаль тыя ж, што і ў дачыненні сялянскіх перасяленняў у Сібір: самавольны адыход прывядзе толькі да разбурэння іх гаспадарак. Аднак адміністрацыйна-паліцэйскія метады аказаліся неэфектыўнымі [7, с. 10]. Вельмі моцным аказалася імкненне многіх сялян палепшыць ці набыць уласную гаспадарку, дарэчы сталася агітацыя тайных агентаў, іх размовы аб выгадах працы за мяжой. Акрамя таго, многія мерапрыемствы органаў улады прабуксоўвалі праз абыякавасць да выканання службовых абавязкаў ці карумпіраванасць чыноўнікаў.

Апублікаваныя матэрыялы абследавання 1911 г. дазваляюць звярнуць увагу на дынаміку ўзнікнення пачатковых школ. На момант правядзення перапісу ў беларускіх губернях было зарэгістравана 8384 пачатковыя школы, з іх толькі 2448 было адчынена да 1894 г. (29,2 %) [8, с. 5]. У 1894—1898 гг. у беларускіх губернях было адчынена 497 школ, у 1899—1903 гг. — 1157, у 1904—1908 гг. — 2054, а за два гады — 1909—1910 гг. — 1776 [8, с. 5]. Наогул ва ўсіх без выключэння беларускіх губернях у 1907—1910 гг. назіраўся школьны бум. Колькасць адкрываемых штогод у гэты перыяд навучальных устаноў у 3—7 разоў перавышала аналагічны паказчык за папярэднія гады. Удзельная вага навучэнцаў у агульнай колькасці насельніцтва ў Мінскай губерні павялічылася за 1898—1913 гг. з 3,5 да 6,0 %. Вучні пачатковых школ Беларусі склалі ў 1910 г. 4,6 % ад агульнай колькасці насельніцтва. Тут працавалі 6926 школ і вучыліся 391 606 хлопчыкаў і дзяўчат. Апошнія складалі 26,4 % вучняў пачатковых школ [16, с. 111]. У канцы XIX ст. заходнія раёны Беларусі заўважна апераджалі ўсходнія па ўзроўні пісьменнасці насельніцтва. У пачатку XX ст. сітуацыя змяняецца. Па стане на 1911 г. на першае месца па ўдзельнай вазе вучняў пачатковых школ сярод насельніцтва выходзіць Магілёўская губерня (5,6 %), а ў Гродзенскай яна складала 4,4 %, у Віленскай — 3,9 % [16, с. 112]. У пачатку XX ст. сярод навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў беларускіх губерняў заўважна вырасла ўдзельная вага сялянства і прадстаўнікоў гарадскіх саслоўяў.

У Беларусі фарміраванне класаў і сацыяльных груп буржуазнага грамадства да пачатку Першай сусветнай вайны не завяршылася, як і разлажэнне саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі насельніцтва, што прывяло да таго, што беларускае грамадства па сваёй структуры заставалася шматслойным. У ім напластоўваліся розныя па часе паходжання сацыяльныя групы. На мяжы XIX—XX стст. для беларусаў у параўнанні

з іншымі этнічнымі супольнасцямі еўрапейскай часткі Расійскай імперыі была характэрнай найбольшая ўдзельная вага тых, хто быў заняты ў сельскай гаспадарцы, і мінімальная — у прамысловасці.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Абезгауз, З.Е. Рабочий класс Белоруссии в начале XX в. (1900—1913 гг.) / З.Е. Абезгауз. — Минск: Наука и техника, 1977. — 168 с.
2. Бовыкин, В.И. Финансовый капитал в России накануне Первой мировой войны / В.И. Бовыкин. — М.: РОССПЭН, 2001. — 320 с.
3. Грегори, П. Экономический рост Российской империи (конец XIX—начало XX в.) = Economic growth of Russian empire (end of XIX—beginning of XX century): новые подсчеты и оценки / П. Грегори; пер. с англ. И. Кузнецова, А. и Н. Тихоновых. — М.: РОССПЭН, 2003. — 255 с.
4. Дело об утверждении в уездных раскладочных присутствиях суммы раскладочного сбора по Минской губернии на 1913 г. // Национальный исторический архив Беларуси. — Фонд 333. — Оп. 4. — Д. 15898.
5. Довнар-Запольский, М.В. Народное хозяйство Белоруссии, 1861—1914 гг. / М.В. Довнар-Запольский. — Минск: Изд. Госплана БССР, 1926. — [4], 239, [1] с.
6. Иванова, Н.А. Сословно-классовая структура России в конце XIX — начале XX века / Н.А. Иванова, В.П. Желтова; Рос. акад. наук, Ин-т рос. истории. — М.: Наука, 2004. — 574 с.
7. Каханоўскі, А.Г. Урадавыя мерапрыемствы папярэджання нелегальнай працоўнай эміграцыі сялянства Беларусі (канец XIX — пачатак XX ст.) / А.Г. Каханоўскі // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т. — Мінск, 2011. — Вып. 6. — С. 3—11.
8. Однодневная перепись начальных школ в Империи, произведенная 18 января 1911 года: / М-во нар. просвещения; ред. В.И. Покровского. — СПб.: Тип. Т-ва «Екатерингоф. печ. дело», 1914. — Вып. 8: Виленский учебный округ. Губернии: Виленская, Витебская, Гродненская, Ковенская, Минская и Могилевская. — [26], 134 с.
9. Панютич, В.П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии, 1861—1914 гг. / В.П. Панютич; Акад. наук БССР, Ин-т истории. — Минск: Наука и техника, 1969. — 190 с.
10. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. — СПб.: Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. — [Вып.] 4: Виленская губерния. Тетр. 3 (последняя). — XI, 179 с.
11. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. — СПб.: Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. — [Вып.] 5: Витебская губерния. Тетр. 3. — XIV, 281 с.

12. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. — СПб.: Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. — [Вып.] 11: Гродненская губерния. — XV, 319 с.
13. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. — СПб.: Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1904. — [Вып.] 22: Минская губерния. — XVI, 243 с.
14. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. — СПб.: Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. — [Вып.] 23: Могилевская губерния. — XV, 275 с.
15. Статистический ежегодник России 1914 г. (год одиннадцатый) / Центр. стат. ком. М. В. Д. — Пг.: Тип. Штаба Петрогр. Воен. окр., 1915. — XVIII, 679 с.
16. Улащик, Н.Н. Грамотность в дореволюционной Белоруссии / Н.Н. Улащик // История СССР. — 1968. — № 1. — С. 106—116.
17. Экономика Белоруссии в эпоху империализма, 1900—1917 / М.Г. Матусевич [и др.]; Акад. наук БССР, Ин-т экономики ; под ред. Г.Т. Ковалевского [и др.]. — Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1963. — 423 с.

**Кротов Андрей Михайлович**
*Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины (Гомель, Беларусь)*

# ПОЛЬСКИЕ БЕЖЕНЦЫ В БЕЛАРУСИ В ПЕРИОД ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ И БЕЛОРУСЫ: ПРОБЛЕМЫ ВЗАИМОПОНИМАНИЯ

Первая мировая война до предела обострила польско-русские противоречия. Трудно было ожидать от поляков, являвшихся подданными Российской империи, патриотического порыва в духе «За Веру, Царя и Отечество», а также готовности жертвовать своими жизнями ради побед русского оружия. Отступление русской армии не могло восприниматься поляками трагически. Скорее даже наоборот... К тому же летом 1915 г. российские военные власти стали «эвакуировать» с территории Королевства Польского польское население, или, как писал «Goniec Wielkopolski»: «Гнать людей вместе со скотом» [1]. Поляки смотрели на происходящее как на очередную трагедию: «Сотни тысяч людей двигались под штыком и кнутом на скитание, нужду и голод, в чужой, совершенно неведомый край» [1].